

## *Міхась БОЛСУН*

### *г.Гомель*

Нарадзіўся 23 лютага 1942 года ў вёсцы Балсуны Чачэрскага раёна. З 1965 года – на журналісцкай працы. Быў намеснікам рэдактара чачэрскай райгазеты, галоўным рэдактарам буда-кашалёўскай раёнкі. Доўгі час працаваў старшым рэдактарам і загадчыкам аддзела ў Гомельскім абласным тэлерадыёаб'яднанні. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Беларускага саюза журналістаў. Выпусціў паэтычныя зборнікі «Яблыня ў фаце», «Там, дзе задумлівы Сож», «Спатканне з поўняй», «Пад сузор'ем дабрыні», дакументальную кнігу «Чачэрскі след у навуцы». Лаўрэат міжнароднай прэміі Баяна, абласнога літаратурнага конкурсу імя Івана Мележа. Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя К.Тураўскага, Анатоля Грачанікава. Узнагароджаны знакам СПБ «За уклад у літаратуру». Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ганаровы грамадзянін Чачэрскага раёна.

### САЛДАТКА

Бляск сярпа на плячы.
Песня з поля вядзе.
Горыч слёз уначы.
Промнік кволых надзей:
Вунь вярнуўся сусед,
Можа, прыйдзе і мой…
Колькі зведала бед,
Ёй вядома адной.
Двое ў хаце дзяцей-
Дзве крывінкі яе.
Ёсць спагада людзей,
Бацькі ж ім не стае.
Кліча ў поле зноў лён...
Дзе ж ты, голуб-Сцяпан?
Можа мучыць палон,
Ці памёр дзе ад ран?
Скрухі шэрае лёд.
Радасць ціхая сноў.
...Цвіў блакітам той лён,
Быццам вочы сыноў.



***

Я — пякельнай вайны
дзіця.
Я — зярнятка
славянскай нівы.
Смак усякі
адчуў жыцця,
Знаў бядотны час
і шчаслівы.
Зла чужога
калючы дрот
Мне калоў
у маленстве пяткі.
Грэлі песняй
жаўрук і дрозд.
У жыцці ё ляцеў
без аглядкі.
Раскаціўся
сувой дарог,
Ды з галоўнай
душой не збочыў,
Што вядзе
на родны парог
Днём спякотным
і золкай ноччу.
Свецяць сціпла
вёскі агні.
Вёсны — ў квецені,
зімы— белянць.
Цёпла там
каля дабрыні,
Землякі яе
ў сэрцах спелянць.
За плячыма —
цяжар гадоў.
З плугам, кнігаю
дружаць рукі.
Мудрасць вёскі, яе дзядоў

Перадаць бы
ў спадчыну ўнукам.